# «Талаку» віталі ў Кракаве

**Міжнародны фальклорны фестываль EtnoKrakow прайшоў у Польшчы. Атрымалася сапраўды грандыёзная падзея: 7 фестывальных дзён, каля 50 канцэртаў, больш як 200 артыстаў з 4 кантынентаў. Адметна, што ў ліку ўдзельнікаў фестывалю быў і гурт «Талака» студэнтаў і выпускнікоў кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**



*На сцэне фестывалю EtnoKrakow — гурт «Талака»*

Шырокая фестывальная праграма ўключала выступленні многіх міжнародных зорак этнічнай музыкі з Еўропы, Паўднёвай Амерыкі, Афрыкі і Азіі, танцавальныя майстар-класы і кірмашы музычных інструментаў. Канцэрты праходзілі на некалькіх розных пляцоўках — ад касцёла святой Катарыны, Гарадскога музея інжынерыі да сучасных інтэр'ераў цэнтра «Кракаў», у фармаце вулічных канцэртаў і камерных выступленняў. Так, задача і місія фестывалю Еўрарадыё (стварыць міжнародную платформу для прадстаўлення і прамоцыі артыстаў, чыя крыніца натхнення — рэгіянальныя і мясцовыя музычныя традыцыі) дапоўнілася імкненнямі арганізатараў фэсту «Скрыжаванне» падрыхтаваць мноства майстар-класаў і стварыць шырокую адукацыйную праграму для знаёмства з этнічнай музыкай і традыцыямі Польшчы ды іншых краін. Такім чынам, можна сцвярджаць, што на цэлы тыдзень Кракаў стаў сапраўдным міжнародным цэнтрам фальклорнай музыкі.

Што ж паказалі беларускія выступоўцы на фестывальнай пляцоўцы ў Гарадскім музеі інжынерыі? «Талака» прадэманстравала традыцыйныя жаночыя і мужчынскія спевы, сольныя і калектыўныя (акапэльна і пад акампанемент дуды, скрыпкі, барабана), а таксама танцы і гульні. Праграма выступлення ўключала абрадавыя песні, што выконваліся вясной і ўлетку — на Купалле і ў час жніва, а таксама пазаабрадавыя спевы і танцы «Сямёнаўна», «Полька», «Каваль», «Дуда-весялуха». Як распавёў кіраўнік гурта, загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Вячаслаў Калацэй, кожны з нумароў, прадстаўленых «Талакой» на фэсце, дэманструе адметныя рысы беларускай традыцыйнай культуры і мае сваю гісторыю. Так, гучалі песні са зборніка вядомага фальклярыста Міхала Федароўскага, дударская музыка з рэпертуару трупы Ігната Буйніцкага, выконваліся танцы з калекцыі этнахарэолага Міколы Козенкі. Песня "Вясна на калочку" і мужчынскі спеў "За Сібірам сонца ўсходзіць" былі запісаныя вядомай даследчыцай традыцыйнай культуры беларусаў Зінаідай Мажэйкай.



*На гляках граюць Аляксандр Масібут і Вячка Красулін.*

Цікава, што студэнты кафедры таксама робяць свой унёсак ва ўзбагачэнне рэпертуару гурта. Да прыкладу, казачая жаночая песня «Ой выйду я» выконваецца «Талакой» толькі некалькі гадоў: яе «прывезла» з Палесся тагачасная студэнтка (цяпер ужо выпускніца) і носьбіт Юлія Сахарчук.

Дарэчы, гурт БДУКіМ не ўпершыню выступаў на сцэне фестывалю. Летась калектыў «Ветах» прадстаўляў нашу краіну ў шведскім Ратвіку, а некалькі гадоў таму выступаў на фестывальных сцэнах нямецкіх Рудольштата і Кёльна, а таксама — харвацкай Апатыі.

**Марына ВЕСЯЛУХА,**
**фота аўтара**

*Кракаў — Мінск*



*Вакалісткі Эльвіра Сцельмашук і Марына Шэлег.*